# ЗМЕСТ


I ........................................ 5

II ........................................ 8

III ........................................ 14

IV ........................................ 18

V ........................................ 23

VI ........................................ 30

VII ........................................ 32

VIII ........................................ 36

IX ........................................ 43

X ........................................ 46

XI ........................................ 54

XII ........................................ 57

XIII ........................................ 58

XIV ........................................ 64

XV ........................................ 69

XVI ........................................ 74

XVII ........................................ 76

XVIII ........................................ 81

XIX . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 82
XX. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 84
XXI . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 86
XXII . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 97
XXIII . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 99
XXIV . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 100
XXV . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 104
XXVI . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .110
XXVII . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 122

## I

Мне было шэсць гадоў, калі ў кнізе пра джунглі, якая называлася «Непрыдуманыя гісторыі», я ўбачыў аднойчы дзівосны малюнак. Змяя — страшэнны ўдаў — глытала драпежнага звера. Вось як гэта было намалявана:



У кнізе гаварылася: «Удавы глытаюць сваю ахвяру цалкам, не жуюць. Пасля гэтага яны ўжо не могуць варухнуцца і цэлых паўгода спяць, пакуль не пераструбуюць ежу».

Я шмат разважаў пра поўнае прыгод жыццё ў джунглях і таксама намаляваў тоесёе каляровым алоўкам. Гэта быў мой малюнак №1. Вось што я намаляваў:



Я паказаў свой шэдэўр дарослым і пацікавіўся, ці не страшна ім, калі яны глядзяць на мой малюнак.

— А чаму капялюш павінен наводзіць страх? — здзівіліся яны.

На маім малюнку быў зусім не капялюш. На маім малюнку быў удаў, які праглынуў слана. Тады я намаляваў удава знутры, каб дарослым было больш уцямна. Але ім усё роўна спатрэбіліся тлумачэнні. Мой малюнак №2 быў такі:



Дарослыя параілі мне не маляваць удаваў ні звонку, ні знутры, а лепей больш цікавіцца геаграфіяй, гісторыяй, арыфметыкай і правапісам. Вось так, у шэсць гадоў, мяне пераканалі адмовіцца ад бліскучай кар’еры мастака. Я быў збіты з панталыку няўдачай з малюнкамі №1 і №2. Дарослыя ніколі і нічога не могуць дацяміць самі, а дзецям надта ж утомна вечна тлумачыць ім, што да чаго.

Такім чынам, мне трэба было выбраць якую-небудзь іншую прафесію, і я пайшоў у лётчыкі. Дзе мне толькі не давялося быць! І геаграфія сапраўды спатрэбілася мне. Я мог з першага погляду адрозніць Кітай ад Арызоны. Гэта вельмі карысна, калі часам заблудзішся ўночы.

За сваё жыццё мне давялося сутыкнуцца з многімі сур’ёзнымі людзьмі. Я многа часу пражыў з дарослымі, быў вельмі блізка

І з нейкай задуменнасцю дадаў:

— Калі ісці толькі куды вочы глядзяць, далёка не зойдзеш...

## IV

Так мне стала вядома яшчэ адна вельмі важная акалічнасць: яго родная планета была бадай ці большая за хату!

Зрэшты, гэта не вельмі здзівіла мяне. Я добра ведаў, што апроч вялікіх планет, такіх, як Зямля, Юпіцер, Марс, Венера, ёсць яшчэ сотні іншых, якім нават імёнаў не далі, такіх дробненькіх, што іх і ў тэлескоп цяжка разгледзець. Калі астраном адкрывае такую планету, ён дае ёй не імя, а проста нумар. Напрыклад, называе яе так: астэроід 3251.





У мяне ёсць сур'ёзныя прычыны думаць, што планета, адкуль прыляцеў Маленькі прынц, — гэта астэроід Б-612. Гэты астэроід быў заўважаны ў тэлескоп толькі адзін раз, у 1909 годзе, адным турэцкім астраномам.

Астраном паведаміў тады пра сваё адкрыццё на Міжнародным астранамічным кангрэсе. Але ніхто яму не паверыў. А ўсё з-за таго, што астраном быў апрануты па-турэцку. Такі ўжо народ гэтыя дарослыя!

На шчасце рэпутацыі астэроіда Б-612, тагачасны турэцкі правіцель загадаў свайму народу пад пагрозай смерці апранацца на еўрапейскі лад. Той астраном у 1920 годзе





зноў паведаміў пра сваё адкрыццё, — цяпер ён быў ужо ў надзвычай элегантным касцюме. Гэтым разам усе паверылі яму.

Калі я расказаў вам усе гэтыя дэталі пра астэроід Б-612, калі я даверліва паведаміў вам яго нумар, дык гэта толькі з-за дарослых. Дарослыя любяць лічбы. Калі гаворыш ім пра свайго новага сябра, яны ніколі не пытаюцца пра сутнасць. Яны ніколі не цікавяцца: «Які ў яго голас? Якія гульні ён любіць? Ці ловіць ён матылёў?» Яны пытаюцца: «Колькі яму гадоў? Колькі ў яго братоў? Колькі ён важыць? Колькі зарабляе яго бацька?» Толькі тады ім здаецца, што яны ўведалі чалавека. Калі скажаш дарослым: «Я бачыў прыгожы дом з ружовай цэглы,

што правільна перадаў колеры яго світкі. Вось і спрабуеш маляваць і так і гэтак. Але няхай ужо гэта прабачаць мне. Мой сябар ніколі нічога не тлумачыў. Ён, мусіць, думаў, што я падобны на яго. Але, на няшчасце, я не ўмею бачыць баранчыка ў зачыненай скрынцы. Я, мусіць, трошкі падобны на дарослых. Пэўна, я старэю.

## V

Дзень пры дні я ўсё болей даведваўся пра планету Маленькага прынца, пра тое, як ён пакінуў яе, як вандраваў. Ён расказваў пра гэта патрошку, калі прыходзіла да слова. Так, на трэці дзень я даведаўся пра трагедыю з баабабамі.

Гэтым разам дапамог баранчык. Маленькі прынц разглядваў малюнак і раптам, нібы яго апанавала цяжкае сумненне, спытаў:

— А праўда, што баранчыкі ядуць кустоўе?

— Праўда, ядуць.

— Цудоўна!

